сыграть «непосредственно», без предварительной драматургической работы, предназначенной для выбора важнейшего аспекта произведения, который следует выделить на сцене. Как только прочтение состоялось, конкретное воплощение произведения становится зависимым как от эпохи и обстоятельств постановки, так и от публики, к которой это представление обращено» [3, с. 124]. Режиссерская интерпретация ищет подтекст и следует за развитием смысла. Режиссерская интерпретация сродни определению Р. Барта: интерпретировать – не значит придавать единый смысл, напротив, оценить, к какому множеству он принадлежит.


1. *Зингерман, Б. И.* Парижская школа: Пикассо. Модильяни. Сутин. Шагал. – М. : Всесоюзн. молодеж. книж. центр, 1993. – 335 с.

2. Интервью с С. Юрским. – Журнал «Neue Zeiten» (Германия) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: www.kino-teatr.ru – дата доступа: 13.09.13 г.

3. *Пави, П.* Словарь театра : пер. с фр. – М. : Прогресс, 1991. – 504 с.

4. Театральна библиотека С. Елфимова : «Полеты с ангелом (седьмая свеча)». [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: www: theatre-libery.ru/autors /s./sagalov_zinoviy. – Дата доступа: 07.08.13.

5. *Шагал, М. З.* Моя жизнь / М. З. Шагал. – М. : АСТ : Зебра Е ; Владимир : ВКТ, 2010. – 288 с.

6. Эстетика: словарь / под общ. ред. А. А. Беляева и др. – М. : Полииздат, 1989. – 447 с.

7. *Эфрос, А.* Профили: Очерки о русских художниках. – СПб. : Азбука-классика, 2007. – 320 с.



***К. І. Шык,*** *магістар педагагічных навук,*
*выкл. каф. рэжысуры абрадаў і свят БДУКМ*


## РОЛЯ СВЯТАЎ У ЖЫЦЦІ МОЛАДЗІ

У нашай краіне існуе шмат разнастайных па сваёй спецыфіцы і тэматыцы свят, якія займаюць пэўнае месца ў жыцці моладзі. У самой прыродзе чалавека закладзена неабходнасць арганічнага спалучэння будняў і свят.

Моладзь, якая з'яўляецца адной з прагрэсіўных частак насельніцтва, прымае актыўны ўдзел у шматлікіх святах як у якасці удзельнікаў, так і гледачоў. На працягу стагоддзяў беларусы стваралі разнастайныя формы абрадаў і свят, якія адлюст-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роўвалі розныя бакі грамадскага жыцця. Святы заўсёды з'яўляліся неад'емнай часткай беларускага народа, бо немагчыма ўявіць сабе нашу краіну без святочнай культуры, якая на працягу стагоддзяў захоўвала, назапашвала, перадавала і ўзбагачала агульную культуру Беларусі.

У навуковай літаратуры склалася даволі featherrознабаковая карціна падыходу да паняцця «свята». Першыя спробы навуковага азначэння свят з'явіліся на мяжы XIX–XX стст. Сярод насельніцтва тэрмін «свята» часта ўжываецца для характарыстыкі эмацыйных станаў (свята пачуццяў, эмоцый, душы, сэрца), адзначэння дня святкавання, грамадскіх, асабістых урачыстасцяў, што адлюстроўвае толькі адну яго грань. Азначэнне свята даецца амаль ва ўсіх тлумачальных слоўніках. Так, напрыклад, у «Слоўніку царкоўных тэрмінаў» – гэта дзень, у які адзначаецца памяць святога, у імя якога асвячоны храм або прыбудоўка храма» [1, с. 166].

Дадзенае азначэнне аднабаковае, бо звязана толькі з рэлігіяй. Больш разгорнутая характарыстыка свят даецца ў «Энцыклапедычным слоўніку» Бракгаўза і Эфрона. Складальнікі вылучалі святы не толькі рэлігійныя, але яшчэ і свецкія, што значна пашырае фармуліроўку гэтага паняцця. Рускі даследчык І. М. Снегіроў адзначае, што «свята выяўляе скасаванне, свабоду ад будзённых прац, злучаную з весялосцю і радасцю. Свята ёсць вольны час, абрад – знамянальнае дзеянне, прыняты спосаб здзяйснення ўрачыстых дзеянняў» [2, с. 5]. Такім чынам, слова «свята» азначае вызначаны перыяд часу (гадзіна, дзень або дні), калі людзі не займаюцца асноўнымі справамі і маюць вольны час. Яно характарызуе такі вольны час, калі штосьці адзначаюць, да прыкладу вызначаную падзею, якую неабходна вылучыць з патока іншых падзей. Апошняе дасягаецца ў святочным абрадзе або рытуале, г. зн. у вызначаным сімвалічным дзеянні, якое мастацкі-выразна аформлена, а да таго ж заўсёды звязана з чымсьці незвычайна радасным або ўрачыстым.

Па меркаванні Л. С. Лапцевай, свята – гэта традыцыйная народная форма адпачынку, гэта задавальненне патрэбы чалавека ў масавых зносінах, гэта від народнай творчасці ў якім пераклікаюцца і спалучаюцца ў новым мастацкім і сэнсавым выглядзе ўсе віды і жанры мастацтва [3, с. 5]. Больш глыбокае азначэнне дадзена П. А. Гудам, які вызначае свята як урачы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стасць, сукупнасць звычаяў, абрадава-рытуальных, відовішчных і масава-гульнёвых дзей, якія адлюстроўваюць падзею ў жыцці грамадства, калектыва, асобы і замацоўваюць пэўныя погляды, пачуцці, адносіны людзей да грамадства, культуры, прыроды і паміж сабой [4, с. 21].

Філосаф І. Ю. Рыбнікава лічыць, што здольнасць адзначаць святы – гэта істотнае адрозненне чалавека ад жывёл, а святочныя гульні – адзін з устойлівых агульнагістарычных відаў чалавечай дзейнасці [5, с. 14].

Можна сказаць, што свята – гэта выяўленне і замацаванне гістарычных ведаў народа, якія ўвасоблены сродкамі мастацтва, а таксама спосаб адпачынку людзей ад будзённых справаў, дзе могуць выяўляцца арганізатарскія, творчыя, духоўныя, камунікатыўныя і іншыя здольнасці чалавека. Свята – гэта дзейсная сістэма, накіраваная на навучанне, развіццё і выхаванне чалавека. Выхаваўчая роля святаў праяўляецца праз уздзеянне на кожнага маладога чалавека, што ўплывае на ўклад яго жыцця і ў цэлым на грамадства, развівае ў моладзі пачуццё асабістай і нацыянальнай годнасці, спрыяе ўсведамленню сваёй ролі ў жыцці краіны.

Усе святы ўмоўна можна падзяліць на некалькі груп. Першая група – гэта каляндарныя святы, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на цыклы адпаведна порам года: зімовыя, веснавыя, летнія і восеньскія святы. Другая група – гэта хрысціянскія святы, якія падзяляюцца на праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія, пратэстанцкія і інш. Трэцяя група – гэта дзяржаўныя святы, якія ўсталёўваюцца ў азнаменаванне падзей, якія маюць вялікае гістарычнае ці грамадска-палітычнае значэнне для краіны і аказваюць уплыў на развіццё грамадства: Дзень Незалежнасці, Дзень Перамогі, Дзень Герба і Сцяга і інш. Чацвёртая група – прафесійныя святы, якія створаны для ўшанавання значнасці асобных прафесій: дзень работнікаў культуры, дзень настаўніка, дзень мытніка і інш. Пятую групу складаюць новыя святочныя формаутварэнні, у гэту групу ўваходзяць святы, якія запатрабаваны сучаснасцю (свята інтэрнэта, свята лесу, свята мёду і г. д.).

Асаблівай папулярнасцю сярод моладзі карыстаюцца народныя святы, такія як Каляды, Масленіца, Купалле, Дажынкі, якія ўжо даўно ператварыліся з мястэчковых, сакральных у вялікія маштабныя святочныя дзеі, якія адзначаюцца на дзяржаўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узроўні. Асобнае месца ў народных святах займае кірмаш як яскравае гульнёва-гандлёвае свята, у якім спалучаюцца амаль усе віды мастацтва.

Маладыя людзі таксама любяць наведваць святы народных рамёстваў, вечарыны ў гонар юбілеяў выдатных дзеячаў беларускай літаратуры, культуры і мастацтва, шматлікія фестывалі рэгіянальнага, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, такія, як «Славянскі базар у Віцебску», «БайкФэст» (г. Брэст), Усебеларускі фестываль народнага гумару (в. Аўцюкі), «Крутагорская радуга» (г. Дзяржынск), «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы), Фестываль феерверачнага мастацтва «Навальніца» (г. Лагойск) і іншыя, шырокавядомыя ў нас і за мяжой. Улічваючы рэлігійную шматканфесійнасць нашай краіны, сярод насельніцтва яскрава замацаваліся і хрысціянскія містэрыі, і шматлікія духоўныя святы. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца святы гарадоў і вёсак, спартыўныя, святы на вадзе і інш.

Аналізуючы вышэй напісанае, можна сказаць, што свята – гэта не толькі спосаб забавы і адпачынку, а феномен, які адыгрывае важную ролю ў жыцці чалавека.

Святы падтрымліваюць і ўмацоўваюць духоўную сувязь паміж членамі грамадства, стымулююць групавую кансалідацыю, спрыяюць самаідэнтыфікацыі членаў групы, класа, грамадства, арганізуюць супольную жыццядзейнасць людзей. У гэтым складаецца галоўнае адрозненне свята як сродку з’яднання людзей ад іншых відаў іх супольнай дзейнасці.

Свята актуалізуе каштоўнасці народа, тым самым яднаючы яго удзельнікаў. Разам з тым, ператварыўшыся ў традыцыю, свята злучае духоўнымі ніцямі пакаленні, падтрымліваючы адзінства грамадства. Гэта можна прасачыць у такіх святах, як «Дзень Перамогі», «Дзень Незалежнасці», «Свята беларускай мовы», дзе моладзь разам з людзьмі старэйшымі за сябе прасякнута адзінай мэтай і ідэяй. Свята не проста забяспечвае адзінства каштоўнасных арыенціраў, але мае прамое дачыненне да фарміравання каштоўнасна-маральных накірункаў маладога пакалення.

Сістэма масавых свят у нашай краіне – гэта своеасаблівая педагагічная сістэма, якая арганічна звязаная з ўсёй выхаваўчай работай у пэўнай сацыяльнай злучнасці. Яна забяспечвае сталае выхаваўчае ўздзеянне на людзей, адлюстроўвае іх светапогляд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак існуе і іншы бок святочнай дзейнасці, калі арганізатары ў пагоні за грашыма ствараюць нізкаякасныя, антыдухоўныя святы, капіруюць не самыя лепшыя ўзоры замежных мерапрыемстваў, што дрэнна адлюстоўваецца на культуры маладога пакалення. Гэта не азначае, што з'яўленне новых свят ёсць кепска, наадварот новыя святочныя формаўтварэнні – гэта абавязковая ўмова існавання чалавека, грамадства і дзяржавы.

Такім чынам, можна адзначыць, што значэнне святаў у жыцці моладзі і грамадства ў цэлым, цяжка пераацаніць. Валодаючы агульнымі характэрнымі рысамі, кожнае свята з'яўляецца люстэркам сваёй эпохі. У ім адлюстроўваецца гістарычнае, духоўнае жыццё грамадства, ідэі, інтарэсы і імкненні самых розных сацыяльных пластоў. Многія аспекты і функцыі свята спрыяюць таму, што ў святочны перыяд асоба знаходзіць магчымасць значна больш поўнага жыцця, чым у будні. Дачыненне чалавека да свята вызначаецца перадусім яго раннімі перыядамі сацыялізацыі, калі падчас выхавання ён успрымае культурныя нормы, звычаі, каштоўнасці свайго народа. Што ў значнай меры падкрэслівае важную ролю святаў у жыцці моладзі.


1. *Покровский, Д.* Словарь церковных терминов / Д. Покровский. – Sharon, Massachusetts : «IzographStudio», 2002. – 166 с.

2. *Снегирев, И. М.* Русские простонародные праздники и суеверные обряды / И. М. Снегирев. – М., 1837. – Т. 1.

3. *Лаптева, Л. С.* Социально-эстетическая природа и функции массового праздника : автореф. дис. … канд. философ. наук : 09.00.01 / Л. С. Лаптева. – М., 1975. – 28 с.

4. *Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапам. / П. А. Гуд. – Мінск : БДУКМ, 2005. – 224 с.

5. *Рыбникова, И. Ю.* Бытийный статус праздника : автореф. дис. ... канд. философ. наук: 09.00.01 / И. Ю. Рыбникова. – Омск, 2001. – 20 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ